ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 138 (520) Субота, 10 сьнежня 1927 г. | Выходзе тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год вып. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

ТРЭБА ЎПАРТА НАСТОЙЛІВА РАСТЛУМАЧВАЦЬ.

У папярэднім нумары газэты мы прысьвяцілі цэлую старонку пытаньню рэлігіі і мэтадам барацьбы з ёю.

У хуткім часе будзе цэлы „сэзон“ рэлігійных сьвятаў („каляды“, „хрышчэньне“ і г.д.). І побач з нахадам сьвятаў шчыльна падыходзіць хваля зьвязаных з імі абрадаў, варажбы і іншых шматлікіх відаў зацямненьня галоў.

У нас, у комсамольскай арганізацыі, трэба адкрыта прызнаць, што антырэлігійная праца за апошні час значна падкульгвае.

Многія ячэйкі, асобныя хлапцы ня ўцямілі належна сабе формы барацьбы з рэлігіяй, часам праводзячы барацьбу ня супроць рэлігіі, а супроць веруючых.

Наша тактыка—шляхам працяжнай працы, тлумачэньняў адцягваць працоўных ад рэлігіі, даводзячы пераканаўча і асноўна ўсю цану рэлігіі.

Ня ўчыняць папу, „рэбэ“, ці ксяндзу брыдотаў— „падкладваць сьвіньню“ яшчэ далёка ня значыць ажыцьцяўляць антырэлігійную пропаганду.

Падобную гора-„тактыку“ трэба здаць у архіў (і значная частка ячэек даўным даўно гэта зрабіла).

Выкарыстаць кнігі па антырэлігійных пытаньнях, наладзіць пры дапамозе часопісі „Бязбожнік“ антырэлігійны куток, добра падрыхтаваць шэраг гутарак—вось чым можна палажыць на абедзьве лапаткі рэлігію. Мы павінны ўвасрасціць традыцыі так званых камсамольскіх каляд, „штурмуючы неба“ ня толькі прыгожымі плякатамі, але і штодзеннай упартай і настойлівай растлумачальнай працай.

Антырэлігійная прапаганда павінна заняць значнае месца ў працы комсамольскіх ячэек, асабліва вясковых.

Спаткаем „каляды“ і іншыя сьвяты рэлігійнага асортымэнту ў поўнай баявой падрыхтаванасьці антырэлігійнай пропаганды.

Організуем комсамольскую выстаўку
(Горад Бабруйск)

У хуткім часе адбудзецца акруговая конфэрэнцыя Бабруйскай організацыі ЛКСМБ. АК ЛКСМБ парашыў продэмонстраваць да гэтага часу дасягненьні нашай організацыі ў шматгадовай працы, шляхам утварэньня акруговай комсамольскай выстаўкі. Для гэтай справы ўжо вылучана камісія з 7-мі таварышоў, распрацован плян гэтага пачыну. На выстаўку ўскладаецца задача, акрамя падвядзеньня вынікаў працы наогул, перанясеньня з набытага вопыту працы аднэй часткі організацыі ў другую.

Выстаўка складаецца з наступных аддзелаў:

— Дыяграмы колькаснага і якаснага складу акруговай організацыі, карпусной організацыі КСМ і актыву, а таксама піонэраў.

— Аддзел вопыту нашай працы — «насьценная акруговая газэта вопыту».

— Вытворчы і сельска-гаспадарчы аддзел (модэлі, эмблемы, вынаходжаньні і дасягненьні асобных ячэек у гаспадарчай працы прамысловасьці і сельскай гаспадаркі).

— Літаратурна-мастацкі.

— Ваенны аддзел, сумесна з фізкультураю.

— Піонэрскі аддзел.

У сваю чаргу піонэрскі аддзел падзяляецца на наступныя пад'аддзелы:

— Тэхнічна-вынаходніцкі, электра, радыё, плянэры, паравозы, машыны і г. д. зробленыя з дрэва, мэталю і інш.

— Адбіцьцё сваёй вытворчасьці, пры якім атрад існуе: модэлі заводаў, варштатаў, прылад вытворчасьці і вырабаў самой вытворчасьці.

— Ручная праца: рукадзельле, пераплётная, швэйная, сталярная, і розныя вырабы.

— Мастацкі: малюнкі, карціны, розная апрацоўка і г. д.

— Адбіцьцё свайго краю: модэлі хат, грамадзкіх організацый, РВК, станцый, школ, вёскі, прылад вытворчасьці вёскі, хатні інвэнтар, вясковыя паясы, кросны, хлявы і г. д.

— Аддзел піонэрскага друку. кнігі і лепшая насьценная газэта.

— Вопыт працы ў дописах, мастацкі написаных па пытаньнях: заданьне, досуг, грамадзка-практычнае, вайсковае самадзейніцтва, працоўнае, тэхнічнае, масаваадзараві цельная праца з дадаткам адпаведных малюнкаў да допісаў.

Посьпех выстаўкі, як відаць, будзе залежаць ад таго, наколькі ўсе комсамольскія і піонэрскія організацыі разварушацца і прыме актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да яе.

Тут неабходна будзе РК і ячэйкам хутчэй аформіць і даслаць АК матар'ялы кастрычнікавага закліку ў організацыю, каб можна было канчаткова падагуліць склад організацыі, прыслаць неабходныя экспонаты і апісальны матар'ял (праз райкомы), характарызуючыя нашы дасягненьні і недахопы ва ўсіх галінах працы: па рацыяналізацыі вытворчасьці, удзелу ў вытворчых нарадах; вынаходжаньне комсамольцаў і беспартыйнай моладзі; удзел вясковых ячэек у інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі (пераход на шматпольле, пры ўдзеле комсамольскіх ячэек, пасеў агракультурных траў, корм скаціны па паказаньнях аграномаў); удзел ячэек у працы гарадзкога савету, сельсавету, крэсткому, коопэрацыі, школы хаты-чытальні, клюбу, па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод насельніцтва, мерапрыемствы комсамольскіх ячэек па торфаздабываньню, мэліорацыі і інш.; лепшыя насьценныя газэты, літаратурная творчасьць, мастацкія малюнкі, лепшыя агітацыйныя плякаты.

АК ЛКСМБ спадзяецца, што організацыя зробіць усё неабходнае для падрыхтоўкі да выстаўкі. Чакаем у хуткім часе матар'ялаў.

Камісія.

Паважай сваю працу і беражы свой час.

Гаворачы аб экономіі, чытаючы кожны дзень аб новым прыстасаваньні, увеценым на заводзе і фабрыцы, якое экономіць у вытворчасьці і час, і цэны, абурваючыся ә прычыны накладных выдаткаў у нашай коопэрацыі, якія яна ч сам недастаткова хутка зьніжае, мы у той-жа час сваю прыватную працу, сваё штодзеннае жыцьцё, вядзем так, як быццам у нас шмат часу і надзвычайна многа сіл і здароўя.

Возьмем нашу вёску. У большай сваёй частцы яна, як і раней, вядзе сваю звычайную працу так, як вялі яе бацькі і дзяды. Вядзе яна сваю працу не сьпяшаючы, а галоўнае не стараючыся з'экономіць ні хвілінкі вольнага часу, ні хаця-б крыху сіл, якія трацяцца на сапраўды цяжкай сялянскай працы.

— Як жыў мой бацька, так пражыву і я,—вось звычайны адказ.

З гэтым наша вясковая моладзь павінна павесьці рашучую барацьбу. Калі некаторых упартых старыкоў не пераробіш, калі яны такімі-ж як і іх бацькі ўйдуць у магілу, дык ёсьць-жа ў вёсцы вялікая частка сьвядомага сялянства, якая ўбачыўшы новы насьпяховы вопыт моладзі пойдзе за ёю. Вось чаму на долю цяперашняй вясковай моладзі выпала цяжкая, але карысная задача: зламаць стары закасьцянелы вясковы быт і даць новыя навыкі ў працы, новыя спосабы сялянскай працы, якія не адымалі-б так бязьлітасна ў сялянства яго час, здароўе і сілы.

На XV зьезьдзе УсеКП

Даклад тав. АРДЖАНІКІДЗЕ.
ЦКК на варце адзінства партыі.

На ранішнім пасяджэньні зьезду 7-га сьнежня са справаздачаю аб рабоце ЦКК і НК РСІ выступіў тав. Арджанікідзе.

Опозіцыя хацела абярнуць ЦКК у прымірыцельную камэру.

Опозіцыя хацела бачыць у ЦКК «лёяльную» організацыю, якая павінна была-б выконваць функцыі прымірыцельнай камеры паміж партыяй і опозіцыяй, але, канечна, опозіцыя ў гэтым жорстка памылілася. Мы ня былі-б ленінцамі, каб абярнуліся ў якую - сьці прымірыцельную камеру. ЦКК з першых-жа крокаў разбураючай дзейнасьці опозіцыі заняла ў адносінах да яе пэўную лінію, лінію накіраваную да захаваньня адзінства партыі, да забесьпячэньня партыйнай дысцыпліны.

Мы неаднокраць папераджалі опозіцыю.

Што-ж рабіла ЦКК у той час, калі опозіцыя разьвівала сваю злачынную работу? ЦКК рабіла ўсё, што магчыма зрабіць, каб вярнуць опозіцыю на ленінскі шлях, з якога яна зышла. ЦКК праяўляла нязвычайную мяккасьць да опозіцыі.

Вядома, напрыклад, што калі мясцовыя організацыі наваліліся на опозіцыйныя групы і сталі выключаць з партыі опозіцыянэраў, дык ЦКК амаль 90 проц. гэтых выключаных аднавіла.

Пасьля апэляцыі Зіноўева да беспартыйных мас, пасьля яго выступленьня ў Калённай Залі Дому Саюзаў, пасьля дэмонстрацыі на Яраслаўскім вакзале, мы папярэджвалі лідэраў опозіцыі аб тым, каб яны зараз-жа спынілі сваю злачынную дзейнасьць. Мы папярэджвалі іх, што ад дэмонстрацыі на Яраслаўскім вакзале — адзін крок да дэмонстрацыі ў Крэмлёўскіх варот.

На жнівеньскім пленуме ЦК мы вазіліся з опозіцыяй некалькі дзён і толькі дзякуючы выступленьням т. т. Сталіна і Молатава пленум заставіў у радох партыі Зіноўева і Троцкага.

Нашу дзейнасьць, якая накіравана да таго, каб дапамагчы лідэрам опозіцыі ўсьвядоміць свае памылкі, яны прымалі за нашу слабасьць, як тое што за імі стаіць уся рабочая кляса. Яны ў гэтым жорстка паміліліся.

Толькі пасьля таго, як усе намеры ЦКК вярнуць лідэраў опозіцыі на ленінскі шлях аказаліся дарэмнымі, толькі пасьля таго, як опозіцыя разгарнула сваю фракцыйную работу, якая перайшла ў работу па організацыі новай партыі, толькі пасьля гэтага ЦКК прымушана была ўхваліць пэўную пастанову аб выключэньні з партыі лідэраў опозіцыі.

Мы ня можам траціць сіл для далейшай барацьбы з опозіцыяй.

Калі опозіцыя цяпер, пасьля ўхвалы зьездам рэзолюцыі па справаздачных дакладах ЦК, у якой зазначаны асноўныя лініі вырашэньня пытаньня аб адзінстве партыі, калі яна і зараз адважыцца абараніць свае погляды, то гэтым самым яна паставіць сябе па-за партыяй.

Мы ня можам траціць нашы сілы і час на далейшую барацьбу з опозіцыяй, бо перад намі стаяць найважнейшыя практычныя пытаньні, якія мы павінны вырашыць.

Дзяржаўны апарат.

Пасьля Кастрычніка пролетарыят прымушан быў карыстацца ў апараце кіраўніцтва тымі тэхнічнымі і культурнымі сіламі, якія засталіся ад буржуазіі. Гэтыя людзі прынесьлі з сабою ўсе бюрократычныя навыкі царскай дзяржаўнай машыны. Адгэтуль—і адна з прычын бюракратызму ў дзяржапараце. І толькі паступова ўдалося нам організаваць і выхаваць свае кадры.

Які наш апарат у сучасны момант.

Бесстаронні адказ павінен быць: наш апарат далёка яшчэ не такі, як патрабаваў тав. Левін, але ён у нашых руках і служыць соцыялістычнаму будаўніцтву. Ён мае шмат недахопаў. Гэтыя недахопы трэба выпраўляць. Але галоўнае—мы маем: ён наш.

Опозіцыя ўвесь час хлусіла на наш савецкі апарат, называючы яго перарадзіўшымся, чужым для інтарэсаў рабочае клясы. Яна ўзводзіла паклёпы на Чырвоную армію, кваліфікуючы яе ледзь не як тэрмідорыянскую.

Як абстаіць справа ў сапраўднасьці з Чырвонай арміяй? Лічбы гавораць, што лік рабочых у ёй павялічваецца з кожным годам, з году ў год павялічваецца ў ёй лік партыйцаў. Чыя гэта армія? Чужая ці наша? Опозіцыя можа быць спакойна, што калі Чырвонай арміі давядзецца абараняць сваю соцыялістычную бацькаўшчыну, яна зможа гэта зрабіць, як трэба. Гэтак-жа абстаіць справа і з іншымі часьцямі нашага апарату.

Тав. Арджанікідзе падае лічбы комуністычнага складу савецкага апарату. Наркамгандаль, напрыклад, дае 22 проц., Наркам'юст—столькі-ж, ВСНГ—20 проц. Менш іншых гэта лічба ў НКЗ 14 проц. Ці апраўдаюць лічбы складу нашых саветаў хлусьню опозіцыі, што ў іх засільле кулакоў? Не, гэта абсолютна няверна. З лічбаў, якія дакладваюцца зьезду, відаць, што саветы напаўняюць бедякі і серадиякі

Ці дала што-небудзь экономія ў прамысловасьці, гандлі, у адміністрацыйнай галіне і г. д. Па словах дакладчыка, ня будзе перавялічана, а наадварот, пераўменшана, калі лічыць усю экономію ў суме да 300 мільёнаў рублёў.

Дырэктывы аб 20-процантным зьніжэньні адміністрацыйна - кіраўнічых выдаткаў, — гаворыць т. Арджанікідзе,—мы павінны і можам правесьці зусім бяз болі. Зьезд павінен ня даць прарваць гэты фронт.

Далейшыя задачы.

Цэнтральнай задачай РСІ застаецца барацьба з бюрократызмам, далейшае паляпшэньне апарату, зьнішчэньне яго недахопаў. Да гэтай работы ў адпаведнасьці з ленінскімі наказамі, павінна быць прыцягнута ўся нізавая грамадзкасьць, усе організацыі, пачынаючы ад партыі і канчаючы коопэрацыяй.

Асаблівае ўвагі РСІ, як і раней, патрабуе праверка выкананьня пастаноў партыі.

Проблема рацыяналізацыі—вось наступная галіна задач. Трэба прыцягнуць тэхнічныя сілы з-за граніцы, пабольш ужываць у сябе дасягненьні замежнай тэхнікі. У пляне ЦКК—РСІ намечаны склік спэцыяльнай нарады ўсіх, што працуюць па рацыяналізацыі.

Ня досыць увагі,—зазначае т. Арджанікідзе,—аддаецца грамадзкай пролетарскай крытыцы. Больш цкаваньня канкрэтных насіцеляў зла—вось што патрабуецца ад нашай партыйнай і савецкай грамадзкасьці, ад нашага друку, які пераважна займаецца стрэлачнікамі. Трэба цкаваць бюракратаў, ня спыняючыся перад асобамі. Больш увагі, роўналегла з гэтым вылучэнству.

Больш ходу маладым таленавітым сілам, якія ў нас часта не выкарыстоўваюцца і заціраюцца.

Зьезд павінен даць лёзунг на ўсю краіну,—заканчвае т. Арджанікідзе: «Адзіным фронтам супроць бюрократызму і скажэньняў» і мы даб'ёмся, што гэтаму галоўнаму злу будзе нанесены рашучы ўдар (доўгія воплескі).

Дакладам т. Арджанікідзе заканчваецца дняўное пасяджэньне 7-га сьнежня.

Чаму Сямёнаў падаў заяву.

Бадай што самае цяжкае для навічка ўступаючага ў партыю, ці ў комсамол— гэта выказаць словамі на вялікім сходзе прычыны свайго ўступленьня перад сходам ячэйкі...

Хто з нас ня меў гэтага пачуцьця, калі нечакана адкуль-небудзь з далёкага кутка сходу прагучыць чыё-небудзь:

— А чаму ўступаеш?

Хочацца многа сказаць, моцна, стройна і прыгожа, але неяк гінуць і ня вяжуцца словы і канчаткова пачырванеўшы адказваеш:

— Так уступіў, значыць!..

Прыблізна так і было з Сямёнавым. Хадзіў ён на сходы, думаў доўга, па-свойму кожную дробязь абмазгоўваючы, але як дайшло да таго, што нехта на сходзе любячы задаваць пытаньні сказаў:

— А што Сямёнаў, усё-ж такі, чаму ты іменна цяпер уступаеш, а не раней?

— Момант такі, разумееш... Момант!..— Сказаў і змоўк.

— Усё!—запытаў сакратар ячэйкі.

— Усё!—сказаў Сямёнаў.

— Ну, а чаму цяпер, зараз, падаў заяву?

— Другі стаў... Ну, словам, другі...

— Добра. Досыць —крыкнулі ззаду.

Кандыдатуру Сямёнава галасавалі. Ячэйка прыняла яго аднагалосна. Але я не здаволены скупым растлумачэньнем Сямёнава, чакаў нецярпліва канца сходу ячэйкі. Мы вышлі з Сямёнавым разам. Мяне цікавіла, як ён дайшоў да гэтага, што якраз цяпер у такі час, напружаны час для партыі, прышоў да яе, прышоў на сход, і гаварыў у першыню свайго жыцьця перад такой колькасьцю сваіх таварышоў. Які шлях ён прайшоў, пакуль дабраўся да століка прэзыдыуму.

Які выпадак прымусіў яго напісаць заяву ў партыю.

І бадай што мой беглы корэспондэнцкі апрос быў для Сямёнава таксама ня менш цяжкі, чым пытаньні таварышоў на сходзе. Ён папрасіў мяне „ня ставіць у газэце ні прозьвішча, ні назвы заводу“. Я згадзіўся. Ды сапраўды, якую роль можа адыгрываць прозьвішча. Мяне-ж цікавіць не яно, а думкі яго...

Я рашыў назваць гэтага скупога на словы саладоўшыка—Сямёнавым.

Доўга гаварыў Сямёнаў. Яго словы былі прасякнуты даверлівасьцю да партыі, разуменьнем яе ролі, яе вернага кіраўніцтва.

Корэспондэнцкі нарыс не дае магчымасьці аб усім расказаць, прыходзіцца гаварыць толькі аб яскравых фактах.

Сямёнаў, наогул, газэт мала чытаў. Але раз у абед на заводзе, у каваля члена бюро ён убачыў, „Праўду“. Быў хмуры каваль. І пранікнуўся Сямёнаў яго хмурасьцю. Разам яны гартанашылі калісьці. Падышоў Сямёнаў, прачытаў. „Праўда“ была за апошні тыдзень.

— Не разумець табе... выказаў каваль.

— Пагледзеў я на яго. Каваль на мяне. Хацеў ён нешта сказаць. А ў галаве маёй усё прадуманае і выстраданае за гэты год мільганула. Устаў я. Да гудка яшчэ некалькі хвілін засталася. Падумаў апошні раз і пабег у ячэйку.

Вось гісторыя Сямёнава, скупога на словы саладоўшчыка з Ляхаўкі, аднаго з 77 тысяч—прышоўшых да партыі...

Ал. Каліта.

Працяг дакладу І. В. Сталіна аб дзейнасьці ЦК УсеКП(б).

Партыя была, ёсьць і будзе па-ленінску адзінай.

Ленінскім маршрутам да соцыялізму наперад—такая непераможная воля бальшавіцкага зьезду.

III. УНУТРЫПАРТЫЙНЫЯ ПЫТАНЬНІ

У чым асноўныя рознагалосьці ў опозіцыі з партыяй.

У апошняй частцы свайго дакладу тав. Сталін адзначыў дасягненьні і недахваты ў галіне партыйнага будаўніцтва, а далей перайшоў да пытаньняў аб дыскусіі і опозіцыі.

— Ці мае які-небудзь сэнс,—кажа тов. Сталін,—якую-небудзь каштоўнасьць дыскусія? Часамі гавораць: на якога чорта вы разьвялі дыскусію, каму яна патрэбна, ці ня лепш было-б вырашыць спрэчныя пытаньні ўнутраным парадкам, ня выносячы сьмецьця з хаты.

Гэта няправільна, таварышы. Дыскусія часамі абсолютна неабходна і бязумоўна карысна. Усё пытаньне ў тым, якая дыскусія. Калі дыскусія працякае ў таварыскіх рамках, у рамках партыйных, калі яна ставіць сабе за мэту сумленную самакрытыку, крытыку партыйных недахватаў, калі яна, значыцца, паляпшае нашу справу і ўзбройвае рабочую клясу,—дык такая дыскусія патрэбна і карысна.

Цяпер мы можам сказаць бяз хістаньняў, што дыскусія ў цэлым дала плюс. Вынікі дыскусіі вядомы. На ўчарашні дзень за партыю галасавала, аказваецца, 724.000 таварышоў, за опозіцыю—4.000 з лішкам. Вось вам вынік. Грымелі ў нас опозіцыянэры, што ЦК адарваўся ад партыі, партыя адарвалася ад клясы, а выявілася, што опозіцыя нават аднаго процанту ня мае. Такі вынік.

Вы спытаеце, з чаго-ж, урэшце, складаюцца рознагалосьці паміж партыяй і опозіцыяй, па якіх пытаньнях праходзяць гэтыя рознагалосьці? Па ўсіх пытаньнях, таварышы. **(Галасы: «*Правільна*»).**

Я мог-бы назваць 7 асноўных пытаньняў, па якіх праходзяць рознагалосьсі паміж партыяй і опозіцыяй.

1. Пытаньне аб магчымасьці пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Опозіцыя адхіляе магчымасьць пераможнага будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне. Адхіляючы-ж такую магчымасьць, яна скатваецца проста і адкрыта на позіцыі меншавікоў. З гэтай установкі выходзілі Каменеў і Зіноўеў, калі яны адмаўляліся ісьці на Кастрычнікавае паўстаньне. І з гэтай-жа ўстаноўкі выходзіў Троцкі, калі ён ішоў на паўстаньне. Бо ён проста гаварыў, што калі пераможная пролетарская рэволюцыя на Захадзе не падасьпее на дапамогу ў больш-менш блізкай будучыні, дык сьмешна было-б думаць, што рэволюцыйная Расія зможа ўстаяць супроць консэрватыўнае Эўропы. Вы ведаеце, што Каменеў і Зіноўеў ішлі на паўстаньне з-пад кія. Ленін іх падганяў кійком, пагражаючы выключэньнем з партыі (*сьмех, воплескі*) і яны прымушаны былі цягнуцца на паўстаньне. Троцкі ішоў на паўстаньне добраахвотна. Але ён ішоў ня проста, а з агаворкаю, якая ўжо тады зьбліжала яго з Каменевым і Зіноўевым. Цікава, што якраз перад Кастрычнікам, у чэрвені 1917 году, Троцкі палічыў за лепшае выдаць у Ленінградзе сваю старую брошуру «Програма міру» як-бы жадаючы гэтым сказаць, што ён ідзе на паўстаньне пад сваім уласным сьцягам. Аб чым-жа ён гаворыць ў гэтай брошуры? Ён палемізуе там з Леніным па пытаньні аб магчымасьці перамогі соцыялізму ў аднэй краіне, лічыць гэту думку Леніна няправільнай і сьцьвярджае, што ўладу прыдзецца ўзяць, але калі не падасьпее дапамога з боку пераможных заходня-эўропэйскіх рабочых, дык безнадзейна думаць, што рэволюцыйная Расія можа ўстаяць перад тварам консэрватыўнае Эўропы, а хто ня верыць у крытыку Троцкага, той хварэе нацыянальнай абмежаванасьцю.

А як ішоў Ленін на паўстаньне, як ішла партыя? Таксама з агаворкай? Не, Ленін і яго партыя ішлі на паўстаньне без агаворак.

2. Пытаньне аб дыктатуры пролетарыяту. Ёсьць у нас дыктатура пролетарыяту, ці няма яе? Пытаньне некалькі дзіўнае (сьмех).

Тым ня менш опозіцыя ставіць яго ў кожнай сваёй заяве. Опозіцыя кажа, што ў нас тэрмідарыянскае перараджэньне. А што гэта азначае?

Гэта азначае, што ў нас няма дыктатуры пролетарыяту, што ў нас правальваецца і адкатваецца назад і экономіка, і політыка, і што мы ідзем не да соцыялізму, а да капіталізму. Усё гэта дзіўна і крыху глупавата. Але опозіцыя настойвае на сваім. Вось вам, таварышы, яшчэ адно разыходжаньне.

3. Пытаньне аб блёку рабочага з серадняком. Опозіцыя ўвесь час утойвала свае адмоўныя адносіны да ідэі такога блёку. Яе пляцформа, яе контр-тэзісы цікавы ня столькі тым, што там гаворыцца, колькі тым, што пастаралася ўтаіць ад рабочае клясы опозіцыя.

Але вось знайшоўся чалавек, І. Н. Сьмірноў, таксама адзін з лідэраў опозіцыі, выцягнуўшы яе на сьвет божы.

І што-ж выявілася? Выявілася, што мы ідзем на пагібель. І калі мы хочам выратавацца, павінны разыйсьціся з серадняком. Ня зусім разумна. Але за тое ясна. І тут меншавіцкія вушы паказаліся, нарэшце, да ўсеагульнага ведама.

4. Пытаньне аб характары нашае рэволюцыі. Калі адхіляецца—магчымасьць пабудовы соцыялізму ў нашай краіне, калі адхіляецца налічча дыктатуры пралетарыяту, неабходнасьць блёку рабочае клясы з сялянствам, дык што-ж застаецца тады ад нашае рэволюцыі, ад яе соцыялістычнага характару? Ясна, што нічога, роўна нічога.

5. Пытаньне аб ленінскай устаноўцы пры кіраўніцтве колёніяльнымі рэволюцыямі. Ленін дапушчаў на пэўныя стадыі і на пэўны тэрмін магчымасьць блёку і нават саюзу з нацыянальнай буржуазіяй колёніяльных краін, калі яна вядзе вайну супроць імпэрыялізму і калі яна не перашкаджае комуністым выхоўваць рабочых і сялянскую беднату ў духу комунізму.

Грэхападзеньне опозіцыі складаецца тут з таго, што яна канчаткова парывае з гэтай устаноўкай Леніна, скатваючыся да ўстаноўкі 2-га Інтэрнацыяналу, які адхіляе мэтазгоднасьць падтрыманьня рэволюцыйнага войска калёніяльных краін супроць імпэрыялізму. Гэтым іменна і тлумачацца ўсе тыя злаключэньні, якія перацярпела наша опозіцыя ў пытаньні кітайскае рэволюцыі.

Вось вам яшчэ адно разыходжаньне.

6. Пытаньне аб тактыцы адзінага фронту ў сусьветным рабочым руху. Грэхападзеньне опозіцыі зьмяшчаецца тут у тым, што яна рве з ленінскай тактыкай у пытаньні аб паступовым заваяваньні мільённых мас рабочае клясы на бок комунізму.

Для таго, каб мільённыя масы рабочае клясы перайшлі на бок комунізму, неабходна, каб масы самі пераконваліся на сваёй уласнай практыцы ў правільнасьці політыкі комунізму. Грэхападзеньне опозіцыі складаецца тут з таго, што яна начыста адмаўляе гэтую тактыку. Захопленая нейкі час, глупа і неразумна захопленая гэтай тактыкай, яна ўсяляк вітала справу зготы з генрадаю Англіі, думаючы, што гэта згода зьяўляецца «аднэй з сур'ёзьнейшых гарантый міру», «аднэй з сур'ёзнейшых гарантый супроць інтэрвенцыі», «адным з сур'ёзьнейшых сродкаў абясшкоджваньня рэформізму ў Эўропе» (Гл. даклад Зіноўева на 14-м зьезьдзе УсеКП(б).



Але жорстка расчараваўшыся ў сваіх надзеях на абясшкоджваньне рэформізму пры дапамозе Пэрсэляў і Хіксаў, яна ўдарылася потым у другую крайнасьць, адхіляючы начыста ідэю тактыкі адзінага фронту. Вось вам, таварышы, яшчэ адно разыходжаньне, якое дэмонструе поўны адыход опозіцыі ад ленінскае тактыкі адзінага фронту.

7. Пытаньне аб ленінскай партыйнасьці, аб ленінскім адзінстве ва УсеКП(б) і ў Камінтэрне. Опозіцыя тут начыста рве з ленінскай організацыйнай устаноўкай, становячыся на шлях організацыі другое партыі, на шлях організацыі новага Інтэрнацыяналу. Вось вам 7 асноўных пытаньняў, якія гавораць аб тым, што на ўсіх гэтых пытаньнях опозіцыя скацілася да меншавізму.

Ці можна лічыць гэтыя меншавіцкія фразы опозіцыі сумяшчальнымі з ідэялёгіяй нашай партыі, з програмай нашай партыі, з яе тактыкай Комінтэрну, з організацыйнай устаноўкай ленінізму.

Ні ў якім выпадку, ні на адну хвіліну.

Вы скажаце: як магла нарадзіцца ў нас такая опозіцыя, дзе яе соцыяльныя карэньні? Я думаю, што соцыяльныя карэньні опозіцыі знаходзяцца ў факце зруйнаваньня дробна-буржуазных пластоў гораду, у абставінах нашага разьвіцьця, у факце нездавальненьня гэтых пластоў рэжымам дыктатуры пролетарыяту, у імкненьні гэтых пластоў зьмяніць гэты рэжым, «палепшыць» яго ў духу ўстанаўленьня буржуазнай дэмократыі.



Што-ж далей?

Што-ж далей?—задае пытаньне т. Сталін. Як быць далей з опозіцыяй?

Раней, чым перайсьці да гэтага пытаньня, я хацеў-бы вам расказаць гісторыю аднаго вопыту супольнай работы з Троцкім, зробленага ў 1911 г. тав. Каменевым. Гэта вельмі цікавае пытаньне. Тым больш, што ён мог-бы даць нам нейкі ключ да таго, каб правільна падыйсьці да пастаўленага пытаньня.

У 1910 г. быў пленум нашага ЦК заграніцай. Ён абгаварваў пытаньне аб узаемаадносінах бальшавікоў з меншавікамі, у прыватнасьці з Троцкім. (Мы складалі тады частку аднэй агульнай з меншавікамі партыі і называлі сябе фракцыяй). Пленум выказаўся за згоду з меншавікамі, а значыць, і з Троцкім, наперакор Леніну, супроць Леніна. Ленін застаўся ў меншынстве. А як-жа Каменеў? Каменеў узяўся зьдзяйсьняць супрацоўніцтва з Троцкім.

Ён зьдзяйсьняў гэтае пытаньне супрацоўніцтва не бяз ведама і згоды Леніна, бо Ленін хацеў на практыцы давесьці Каменеву шкоду супрацоўніцтва з Троцкім супроць бальшавізму.

Каменеў у брошуры «Дзьве партыі», якая напісана ім у 1913 г., апавядае аб гэтым:

«Вопыт супольнай ра[illegible] з Троцкім,—маю права сказаць,—вопыт сумленна мною прароблены, аб чым толькі і сьведчаць мае лісты і прыватныя размовы, якія экспляатуюцца цяпер Троцкім,—паказаў, што прымірэнства няўстрымана скатваецца да абароны ліквідатарства, рашуча становіцца на бок апошняга». (І далей: „о, каб троцкізм перамог, як настрой у партыі,—якая воля была-б для ліквідатарства“).

Вось вам, таварышы, вопыт супольнай працы з Троцкім. **(Голас: «навучальны вопыт»).** Вынікі гэтага вопыту апісаў тады т. Каменеў у спэцыяльнай брошуры, якая вышла ў 1911 г. пад назваю «Дзьве партыі». Я не сумняваюся, што брошура гэта прынесла вялікую карысьць ўсім тым таварышом, якія яшчэ мелі ілюзіі наконт супрацоўніцтва з Троцкім.

І вось у мяне такое пытаньне: ці прабаваў тут Каменеў напісаць яшчэ адну брошуру таксама пад назваю „Дзьве партыі“ наконт цяперашняга попыту яго супрацоўніцтва з Троцкім. (Агульны сьмех, воплескі). Гавораць, што опозіцыя мае на ўвазе падаць зьезду якуюсьці заяву наконт таго, што яна (опозіцыя) падначальваецца і будзе падначальвацца ўсім пастановам партыі. **(Голас: «Таксама, як у кастрычніку 1926 г.»)**

Гавораць, што опозіцыя ставіць таксама пытаньне аб звароце ў партыю выключаных. (Галасы: **«Ня пройдзе, няхай ідуць у меншавіцкае балота»**). Я думаю, таварышы, што гэта таксама ня выйдзе. **(Доўгія воплескі).**

Чаму партыя выключыла Троцкага і Зіноў'ева? Таму, што яны організатары ўсяе справы опозіцыі. **(Голас: «Правільна)».** Таму што яны паставілі сабе мэтаю ламаць законы партыі. Таму, што мы ня хочам мець у партыі дваран. Таму што закон у нас, у партыі, адзін, і ўсе члены партыі роўныя ў сваіх правох.

Калі опозіцыя хоча быць у партыі, няхай яна падначальваецца волі партыі, яе законам, яе зазначэньням без агаворак. Ня хоча яна гэтага—няхай уходзіць, дзе ёй вальней будзе. **(Галасы: „Правільна“).**

Пытаюць аб умовах. Умова ў нас адна: опозіцыя павінна разброіцца цалкам і поўнасьцю і ў ідэёвых і ў організацыйных адносінах. **(Галасы: «Правільна», доўгія воплескі).** Яна павінна адмовіцца ад сваіх анты-бальшавіцкіх поглядаў, адкрыта і сумленна перад усім сьветам. **(Галасы: «Правільна», працяглыя воплескі).**

Агульныя вынікі.

1. Мы адстаялі мір з абкружаючымі дзяржавамі, ня гледзячы на найвялікшыя труднасьці, ня гледзячы на правакацыйныя выпады буржуазіі «вялікіх дзяржаў».

2. Мы ўзмацнілі змычку рабочае клясы СССР з рабочымі імпэрыялістычных краін і калёній, ня гледзячы на шмат перашкод, ня гледзячы на мора хлусьні падкупленага буржуазнага друку.

3. Мы ўзьнялі аўтарытэт пролетарскай дыктатуры сярод мільёнаў працоўных мас ва ўсіх частках сьвету.



4. Мы, як партыя, дапамаглі Комінтэрну і яго сэкцыям узмацніць свой уплыў ва ўсіх краінах сьвету.

5. Мы зрабілі ўсё, што толькі можа зрабіць адна краіна для разьвіцьця і прысьпяшэньня сусьветнага рэволюцыйнага руху.

6. Мы ўзьнялі нашу соцыялістычную індустрыю, устанавіўшы для яе разьвіцця рэкордны тэмп, зацьвердзіўшы яе гегемонію ва ўсёй народнай гаспадарцы.

7. Мы ўстанавілі змычку соцыялістычнае індустрыі з сялянскаю гаспадаркаю.

8. Мы ўзмацнілі саюз рабочае клясы з серадняком пры апоры на беднату.

9. Мы ўзмацнілі дыктатуру пролетарыяту ў нашай краіне, ня гледзячы на варожыя міжнародныя абкружэньні, паказаўшы рабочым усіх краін, што пролетарыят умее ня толькі разбурваць капіталізм, але і будаваць соцыялізм.

А з гэтага вынікае, што, пасоўваючыся па гэтым шляху, мы прыдзем напэўна да перамогі соцыялізму ў нашай краіне, да перамогі соцыялізму ва ўсіх краінах. (Працяглыя воплескі).

Таварышы! Да перамогі комунізму ў нашай краіне, да перамогі комунізму ва ўсім сьвеце (Гучныя і доўгія воплескі. Усе ўстаюць і наладжваюць тав. Сталіну авацыю. Пяюць «Інтэрнацыянал»).



„Рыбак рыбака бачыць здаляка“.

(Белагвардзейцы аб опозіцыі).

Учарашнія рэволюцыянэры Троцкі і Зіноўеў—цяпер куміры і гэроі ўсяго буржуазнага і белагвардзейскага друку. Ужо вянчаюць яны лаўрамі галовы здраднікаў, падносяць ужо ім тытул свабоды і дэмократыі. З-за «слаўнага» сапраўднага Троцкага і Зіноўева белагвардзейцы гатовы дараваць іх «ужаснае» мінулае.

Паслухаем, што гавораць аб нашых «гэроях» «Дні», газэтка, якая рэдагуецца ў Парыжы нашым старым знаёмым Керанскім:

Ішлі годы, прайшло цэлае дзесяцігодзьдзе ў імгле і маўчаньні... Усе агні патушаны і няма надзеі, каб яны ізноў засьвяціліся...

«І раптам вестка: у Маскве запрацаваў вольны друкаваны варштат. Улада ў трывозе і абурэньні яны напалі на сьлед, а потым і заарыштавалі падпольную друкарню, яны знайшлі, што ў іх уласных друкарнях пачалі друкавацца нелегальныя, супроцьурадавыя творы. І хто-ж спрабуе ізноў засьвяціць агні? Свае —Троцкія, Зіноўевы, Прэабражэнскія... Нават ім стала цяжка ў беспрасьветнай імгле безгалоснасьці.

На самой справе, цуда вытвараецца. Учарашнія процівабарацьбіты свабоды друку спрабуюць, пакуль што толькі для сябе, уваскрэсіць яе на Савецкай Русі, хоць-бы ў падпольлі. Вось пакараньне за вялікае злачынства. Падобнае таму, як у някрасаўскай лягэндзе аб «Кудзеяры — атамане».

— Тым-жа нажом, што разбойнічаў.
Зрэж яго той-жа рукою.

Зрэж-жа дрэва злой, крыўднай, маўклівай пакорнасьці, узвыш абвінавачваючы, протэстуючы голас.

Адна ластаўка вясны ня робіць, прытым ластаўка, прылецеўшая з такога краю. Але з другога боку, ліха бяда пачаць. Ад капеечнай сьвечкі Масква згарэла. Хто ведае, можа ад грашовай сьвечкі ў руках патушыцеляў, сьветам свабоднага друку засьвецяцца на Русі тысячы новых, чыстых агнёў у чыстых і самааддава служачых ёй, свабодзе, руках»...

Ці адчувае Троцкі і Зіноўеў гэты братэрскі пацалунак Керанскага? Што адкажуць яны на параду «зрэзаць дрэва злой, крыўднай покорнасьці, узвысіць протэстуючы, абвінавачваючы голас?»

Ня важна, што яны адкажуць. Важна і пікантна тое, што **Керанскі** асьмеліўся даць ім такую параду. Куды ісьці далей?

Але белагвардзейцы ня толькі даюць парады. Яны пачынаюць рыхтавацца. Яны чакаюць. Яны спадзяюцца. На што? Паслухаем іх:

«Бальшавізм, між іншым, мог праіснаваць у Расіі толькі дзякуючы адзінству волі, якая спачатку зьмяшчалася ў Леніне, а потым ва ўсёй організацыі комуністычнай партыі. Але цяпер і гэты момант зьнік. Можна выключыць з партыі тысячы радавых членаў, можна выкінуць нават Троцкага, Зіноўева і іншых правадыроў, але адзінай волі больш няма, і распад партыі нямінучы. А тады новыя сілы, якія даўно ўжо ведаюць цану соцыялістычнаму экспэрымэнту з'організуюцца і ліквідуюць бальшавізм. (Руль).

Кадэцкай газэтцы не зразумець, што партыя можа праіснаваць і бяз Троцкага і Зіноўева, і што воля яе (партыі) яшчэ больш загартуецца ў барацьбе са здраднікамі ленінізму. Але яе зацьвярджэньне лішні раз падцьвярджае тое, што гаварылі опозіцыі ня раз:

— «Вашы выступленьні адчыняюць шлях трэцяй сіле. Яна—рэальны факт, яна толькі чакае хвіліны, каб на нашай сьпіне ўехаць у СССР».

Опозіцыя адмаўляла гэта. Опозіцыя зацьвярджала, што трэцяя сіла ёсьць выдумка ЦК і ДПУ.

Цяпер нават для дзяцей зразумела, хто праў і хто ня праў у гэтым пытаньні. Атэстат, выдадзены «Рулём» і «Днямі», не пакідае ніякіх сумненьняў.

С. Кэмрад.

Рашучы адпор ганебным спробам.

Комсамол непарушна стаіць на ленінскіх позіцыях.

Зьмяшчаем рэшту матар'ялу аб сходах комсамольскіх ячэек, прысьвечаных абгаварэньню тэзісаў да 15-га Зьезду УсеКП(б).

Калі ласка—садзецеся ў галёшу!

(Менск, ячэйка прыватных прадпрыемстваў пры саюзе харчавікоў).

Здаецца, нідзе так ня выявілася адзінства і згуртаванасьць нашай ячэйкі, як на апошнім дыскусійным сходзе. Прысутнічалі ўсе ўваходзячыя ў склад ячэйкі комсамольцы. З увагай заслухоўваецца даклад аб тэзісах ЦК УсеКП па працы ў вёсцы.

Запытаньняў пасьля дакладу—шмат. Што толькі не хвалюе ячэйковую масу?

— Дзе, як ня ў гэтых пунктах яскравей выявілася банкруцтва і нясталасьць кірунку думак опозіцыі, якая цяпер прапануе зусім адваротнае: умацненьне падаткоўвага абкладаньня сялянства, звыш-індустрыялізацыю ў шкоду разьвіцьцю сялянскіх гаспадарак ды інш.

— Опозіцыя, якая блытаецца і супярэчыць сама сабе, сустрэне таксама з боку нашай ячэйкі рашучае асуджэньне і

Ага, Леў Давыдавіч праў: на 11 годзе у вас хвасты ня ізжыты.

— Тут і шляхі распластаваньня вёскі пры нэпе, і пытаньні аб посьпехах хлебазагатовак, і кулацкая небясьпека. Усяго было задана звыш 30 запытаньняў.

У спрэчках,—ніводнага выступленьня на карысьць опозіцыі.

Загадзя, азнаёміўшыся з тэзісамі, комсамольцы даюць правільную і цьвярозую адзнаку сучаснаму становішчу вёскі.

У Зіноўева слабая памяць.

Асабліва заслугоўвае ўвагі перакануўчае выступленьне тав. Цудзіна. Апошні вельмі дарэчы прыпомніў прапановы Зіноўева 2½ гады назад аб «ухіле перад сялянствам», уцягненьні ў комсамол 2 мільёнаў сялянскіх хлапцоў і стварэньні ў вёсцы беспартыйных дэлегацкіх сходаў.

ўзмацненьне ўпэўненасьці ў правасце лініі бальшавіцкага ЦК партыі.

Заключнае слова дакладчыка, які адказвае на запытаньні і, нарэшце, прымаемая аднагалосна рэзолюцыя:

«Абмеркаваўшы даклад аб працы ў вёсцы па тэзісах ЦК УсеКП(б), агульны сход ячэйкі прызнае лінію ЦК партыі па гэтым пытаньні ўпаўне правільнай, рашуча асуджаючы контртэзісы опозіцыі.

Але не аднэй рэзолюцыяй адказала наша ячэйка падрываючай адзінства партыі опозіцыі. **На гэтым-жа сходзе адбыўся прыём у комсамол пяці чалавек беспартыйнай моладзі і аднагалосная рэкомэндацыя ў партыю 6 лепшых комсамольцаў—актывістых, якія праверaны на саюзнай, грамадзкай, профэсыйнай і іншай працы.**

Я. З.

Усе, як адзін.

(Ячэйка ЛКСМБ. профшколы гор. Слуцку).

Уважліва слухалі даклад аб пяцігадовым пляне народнай гаспадаркі. Былі перад гэтымі незразумелыя пытаньні, але дакладчык добра растлумачыў кожнаму яго непаразуменьне.

У аднагалосна зацьверджанай рэзолюцыі падкрэсьліваецца: „троцкісцкая опозіцыя стала на шлях організацыі другой, супроць пролетарскай, супроць ленінскай партыі. Аб гэтым сьведчаць тыя ганебныя мэтоды барацьбы, якія зараз накіраваны супроць партыі Леніна. Агульны сход ячэйкі цалкам далучаецца да пастановы сходу гарадзкога комсамольскага актыву, які вітае пастанову аб выключэньні з партыі правадыроў раскольніцкай опозіцыі—Троцкага і Зіноўева.

В. Багдановіч.

За лінію і заветы Леніна.

(г. Ворша).

За тэзісы ЦК УсеКП(б) да XV партзьезду з 836 комсамольцаў гораду галасавала за—807 чалавек, устрымалася—28 і супроць быў адзін голас.

Таксама прыбываюць весткі і з раёнаў аб ходзе дыскусіі. У вясковых ячэйках дыскусія шырока разгарнулася. З Капыскага раёну паведамляюць, што там комсамольцы дзьвюх вёсак і мястэчка Копысі ў колькасьці 120 чалавек на дыскусійным сходзе цалкам галасавалі за тэзісы ЦК УсеКП(б) да XV парт-зьезду. Таксама і ў Лядняскім раёне на сходах па 13 вясковых ячэйках з лікам 268 чалавек комсамольцаў усе аднагалосна былі за тэзісы партыі. У Горацкім і і ў Мсьціслаўскім раёнах таксама ня маецца опозіцыянэраў.

С. Рабой.



Хутка перавыбары.

Ажывім сельсаветы!

Быць падрыхтаванымі!

Праз 20 з лішнім дзён па ўсёй Беларусі распачнуцца перавыбары сельсаветаў.

Зараз—у разгары справаздачная кампанія.

Комсамольскім ячэйкам трэба прыпомніць беларускую прымаўку—**«адклады ня прывядуць да ладу»** і зараз-жа прыступіць да працы.

Трэба ўсебакова праверыць працу абраных комсамольцаў у сельсавет. Наш саюз у савецкай працы за апошнія гады набыў значны вопыт. Да справаздач комсамольцаў-сельсаветчыкаў трэба падыходзіць з таварыскай крытыкай—як гэты вопыт скарыстан таварышом, як ён выконваў дырэктывы ячэйкі вышэйшых саюзных органаў.

Перавыбарчая кампанія сельсаветаў павінна быць скарыстана для шырокага азнаямленьня моладзі з констытуцыяй БССР, для яшчэ большага ўзмацненьня саюзу беднаты і батрацтва з серадняком.

Неабходна падрыхтаваць і правесьці ў часе справаздачнай кампаніі дні сялянскай моладзі, вечары і спэктаклі.

„Добрага коопэратара набылі".

(У коопэратыве).

Шмат год быў Мікітка пастухом. Яшчэ малым хлапчуком, як адвяла яго матка да шляхціца Банадыся пасьвіць авечкі, дык з таго часу і ня бачыў ён вольнай хвілінкі ў летнія сьпякотныя дні: ад сонца да сонца хадзіў за статкам, дражніў сьвістам птушыны сьпеў, а часам, ад няма чаго рабіць, стаяў у задумёнай непарушнай позе і ляскаў пугаю па шырокіх лісьцях маладых асінак, або алешынах. І ў такіх надакучлівых занятках праводзіў ён гады свае маладосьці.

... Мінулыя перавыбары коопэратыву праходзілі ў лістападзе. Прышоў Мікітка.

Слухаў Мікітка уважліва справаздачу праўленьня, а ў спрэчках выступіў і «крыў» коопэратараў, што яны «зазнаюцца», што яны заможнікам адпушчаюць тавар на павер, а беднаце—«толькі за наличныя прадаем».

Слухала бедната ды поўнасьцю згаджалася з Мікіткам, а калі пачалі высоўваць кандыдатуры ў новае праўленьне—некалькімі галасамі выкрыквалася Мікіткава прозьвішча.

* * *

У будныя дні ў Замошкаўскім коопэратыве ня так многа народу. Іншае—у сьвята. Цэлы дзень уваходная біткам набіта жанчынамі і мужчынамі.

І Мікітка ёмка схватвае катушку мультану з паліцы, разгортвае яго, дае жанчынам паспрабаваць, ці моцны; пакідае на хвіліну кабет—дае мужчынам падэшвы, перады, загатоўкі...

Выходзячы з коопэратыву, мужчыны перакінуцца слоўцамі:

— А усё-ж лоўкага коопэратара набылі мы сабе!

Гарошын.



Чаму цукар дзёгцем сьмярдзіць?

(Старасельскі сельсавет, Копыльскага раёну).

Уся праца сельсавету разьмеркавана паміж 5 камісіямі. Але трэба адзначыць, што некаторыя з камісій **працавалі дрэнна, альбо працу і зусім не пачыналі.** Напрыклад, рэвізійная камісія на працягу ўсяго году не рабіла ні разу рэвізіі.

Як і ў коопэратыве, так і ў прыватных крамах—надзвычайна брудна і няма ніякага парадку. На адных і тых-жа вясох важаць і мазь, і цукар. Прыказчык бярэ ў рукі газу, а потым адважвае цукар. Возьмеш чай піць, а табе дзёгцем пахне,—бо цукер у мазь замусолен. Таксама і іншыя сьядобныя прадукты на ноч нічым не пакрываюцца і на іх асядае ўвесь пыл.

А сельсавет і санітарная камісія на гэта ўвагі не зьвярнулі, не забясьпечылі насельніцтва ад магчымасьці распаўсюджваньня розных хвароб.

Апошні вучот об'ектаў абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам прайшоў добра, дзякуючы толькі комсамольцам, якія сачылі, каб сяляне ня ўкрывалі ні зямлі, ні жывёлы.

Па рамонту дарог, сельсавет нічога не прадпрымаў. КахаНоўская і Жалочынская дарога да таго ў выбоях, што праехаць нельга, а паправіць ніхто і ня зьбіраецца.

Праўда, у сельсавеце ёсьць добрая пажарная дружына, а таксама наладжана праца сярод беднаты.

Фэйгін Б.

Міжнародны агляд.

Дзень за днём.

Толькі СССР вядзе мірную політыку.—Пагроза вайны між Літвою і Польшчаю.—300 тысяч нямецкіх мэталістых перад пагрозай звальненьня.—Жыцьцё кітайскіх рабочых вельмі дрэннае.

Урад СССР у барацьбе за мір.

У Жэневе адчынілася чарговае пасяджэньне Савету Лігі Нацый.

На пасяджэньне зьехаліся міністры па замежных справах: Англіі—Чэмбэрлен, Францыі—Брыян, Нямеччыны—Штрэзэман, Польшчы—Залескі і Літвы—Вальдэмарас.

У цэнтры ўвагі стаяць гутаркі між гэтымі міністрамі і тав. Літвінавым (намесьнік Наркома па замежных справах СССР), які знаходзіўся ў Жэневе, ў зьвяз-ку з удзелам у падрыхтоўчай камісіі па разброеньні.

Перад сваім ад'ездам з Жэневы, па жаданьню абоіх адбылося спатканьне Літвінава з Чэмбэрленам.

Спатканьне дало магчымасьць вольнага абмену думкамі наконт адносін між савецкім і ангельскім урадамі.

Аднак, у працягу гутаркі не ўдалося знайсьці грунту для згоды між абедзьвюма краінамі.

Пасьля гутаркі з Чэмбэрленам, Літвінаў прыняў літоўскага міністра—Вальдэмараса, а потым наведаўся Залескага.

З Вальдэмарасам і Залескім тав. Літвінаў абгаварваў польска-літоўскі конфлікт.

Як вядома, асновай конфлікту зьяўляецца захоп польскім войскам ў 1920 годзе літоўскага гораду—Вільні.

У сувязі з захопам, Літва не згаджаецца на ўстанаўленьне нормальных політычных адносін з Польшчай.

Літоўскі ўрад нават афіцыйна агаласіў, што з моманту захопу Вільні Літва лічыць сябе на становішчы вайны з Польшчай.

Польшча карыстаецца гэтай заявай і распаўсюджвае думку аб тым, нібыта Літва рыхтуецца напасьці на Польшчу.

Гэтай хлусьнёй Польшча загадзя імкнецца апраўдаць свае пляны захопу Літвы.

Зусім зразумела, што пры такіх умовах заява Літвы аб становішчы вайны з Польшчай утварае вялічэзную пагрозу справе міру.

Вось чаму, як і пры ранейшым спатканьні, зараз Літвінаў пераконваў Вальдэмараса ў неабходнасьці спыніць становішча вайны паміж Літвою і Польшчаю.

Абодвым міністрам Літвінаў заявіў, што самае важнае для савецкага ўраду—гэта адхіленьне ўсякіх повадаў да парушэньня міру.

Польска-літоўскі конфлікт абгаварваўся тав. Літвінавым з Брыянам.

Брыян згадзіўся з Літвінавым, што неабходна дасягнуць таго, каб конфлікт між Польшчай і Літвой быў уладжаны мірным шляхам.

Закрануўшы франка-савецкія адносіны, Брыян рашуча заявіў, што непаразуменьні, якія ўзьніклі ў зьвязку з інцыдэнтам з Ракоўскім, можна лічыць канчаткова ліквідаванымі.

Аб разрыве зносін між Францыяй і СССР ня можа быць і гутаркі.

Ці будзе ліквідаваны польска-літоўскі конфлікт.

Адным з пытаньняў, якія будзе абгаварваць Ліга Нацый на сваім пасяджэньні, стаіць пітаньне аб ліквідацыі конфлікту між Літвою і Польшчаю.

Ужо і зараз літоўскі ўрадавы друк зазначае, што Літва ня пойдзе на ўступкі.

Тым часам Польшча хоча дасягнуць формальнага адмаўленьня Літвы ад Вільні, і ўсё гэта яна марыць зрабіць пры дапамозе Лігі Лацый.

Ці ўдасца Лізе Нацый урэгуляваць польска-літоўскі конфлікт?



На гэтае запытаньне можна даць адказ словамі тав. Сталіна з яго дакладу на XV зьездзе УсеКП(б).

Ён кажа:

«Ці былі спробы «мірнага ўпарадкаваньня» насьпяваючых ваенных конфліктаў за апошні пэрыод?

Так, былі.

Іх было больш, чым можна было чакаць.

Але яны ні да чаго роўна ня прыводзілі.

Больш таго, спробы аказаліся толькі прыкрыцьцем падрыхтоўнае працы дзяржаў да новых войнаў, прыкрыцьцем, якое мае сваёй мэтай ашуканства рабочых і сялян».

Кажучы аб здольнасьці Лігі Нацый вырашаць тыя ці іншыя пытаньні аб адносінах між дзяржавамі, ці аб разброеньні, тав. Сталін зазначае, што:

— «... **Ліга Нацый ёсьць ня інструмант міру і разброеньняў, а інструмант прыкрыцьця новых узброеньняў і падрыхтоўкі новых войн».**

У Нямеччыне насьпявае клясавы конфлікт.

Нямецкі профсаюз мэталістых запатрабаваў 8-гадзіннага працоўнага дню і невялічкага павялічэньня заработку.

У адказ на гэта капіталісты заявілі, што яны маюць намер з 1-га студзеня 1928 года зачыніць свае прадпрыемствы.

Зачыненьне яны тлумачаць тым, што ажыцьцяўленьне «надмерных» патрабаваньняў профсаюзаў не дазволіць экономічна выгадна праводзіць апрацоўку жалеза.

Паведамляецца таксама, што буйнейшыя трэсты па выплаўцы чыгуну і сталі скарачаюць закупкі за межамі мэталічнае руды, і маюць намер спыніць зусім працу.

У выпадку ажыцьцяўленьня, гэта будзе азначаць разьлік (лёкаут) не толькі 300 тысяч нямецкіх рабочых мэталістых, але і рабочых іншых галін прамысловасьці.

Такім чынам, ажыцьцяўленьне пагрозы жалезных каралёў унясе вялізарны разлад ва ўсё гаспадарчае жыцьцё Нямеччыны.

Магнаты капіталу спрабуюць зрабіць гвалт над усім працоўным нямецкім народам.

Капіталістыя дасканала падрыхтаваліся да барацьбы, стварыўшы шматмільённыя фонды на выпадак забастовак.

Усё экономічнае жыцьцё Нямеччыны знаходзіцца пад пагрозай сур'ёзнага расстройства.

Цікава адзначыць, што патрабаваньне аб увядзеньні 8 гадзіннага дню профсаюзамі было выдана пасьля таго, як гэткую пастанову вынесла міністэрства працы.

— «Сучасная спроба зрабіць гвалт над цэлым народам з боку некалькіх трэстаў яскрава сьведчыць, што ўся экономічная і політычная моц дзяржавы знаходзіцца ў руках буйных капіталістых»,—піша комуністычная газэта Нямеччыны.

Газэта заклікае профсаюзы не адступаць перад націскам прадпрыемцаў ні на крок, бо ў праціўным выпадку саюзам пагражае поўнае зьнішчэньне.

Далей газэта заклікае ўсю рабочую клясу выступіць на барацьбу і паказаць буйным капіталістычным гвалтаўнікам, што іх сіла канчаецца там, дзе пачынаецца аб'яднаны фронт пролетарыяту.

Рэволюцыйны рух у Кітаі

Па ўсім Кітаі праходзяць зараз забастоўкі рабочых.

Так, напрыклад, некалькі дзён таму назад у Ханькоу (цэнтральны Кітай) забаставалі на баваўняных фабрыках.

Забастоўка выклікана звальненьнем работніц, якія абстрыглі сабе валасы.

Пасьля абвяшчэньня забастоўкі быў наладжаны мітынг, па якім пачала страляць паліцыя.

У выніку—некалькі забітых і параненых.

Тое-ж самае адбываецца і ў Шанхаі.

Усе трамвайныя рабочыя Шанхаю спынілі працу.

Ня лепш становішча і ў іншых буйных прамысловых цэнтрах Кітаю.

Чым выклікаюцца забастоўкі? Адказаць ня цяжка, калі вядома матар'яльнае становішча кітайскіх рабочых.

Каб мець уяўленьне аб жыцьці рабочых Кітаю прывядзем некалькі лічбаў.

Максымальная заробчая плата ў Ухане атрымліваецца электротэхнікамі і электроманцёрамі.

Яны ў месяц маюць 50 рублёў.

Самы меншы заробак у Ухане 1 р. 80 к. у месяц. Вядома гэта плата, якую маюць усе некваліфікаваныя рабочыя, ня можа здаволіць паўгалоднае існаваньне.

І вядома, такое становішча ня можа ня выклікаць рэволюцыйнага руху пролетарскіх мас.

Алёнін.

Правільна будзе расьці зарплата і кваліфікацыя моладзі.

Новая тарыфная сетка для вучняў.

7-мы ўсесаюзны зьезд профсаюзаў і 5-я конфэрэнцыя ЎсеЛКСМ прынялі рашэньне аб увядзеньні спэцыяльнай тарыфнай сеткі для вучняў, занятых у прамысловасьці. Зараз гэтае рашэньне ажыцьцяўляецца на фабрыках і заводах Беларусі.

Сетка захоўвае існуючую зарплату.

Увядзеньне новай тарыфнай сеткі для вучняў патрэбна было для таго, каб урэгуляваць заробак падросткаў. Ніякіх адступленьняў ад існуючай зарплаты ў бок яе зьмяншэньня новая тарыфная сетка для вучняў не дапушчае.

Пры агульным росьце заробчай платы рабочых будзе таксама няўхільна павялічвацца заробак вучняў. Адначасова захоўваюцца процантныя адносіны вучнёўскага заробку да тарыфнай сеткі.

Пры агульным павышэньні заробчай платы будзе таксама ўлічвацца і тое, што вучні зьяўляюцца слаба аплачваемай групай рабочых.

Усё гэта кажа аб тым, што новая тарыфная сетка спрые росту рэальнай зарплаты падросткаў.

Каго абхапляе новая сетка?

Новая тарыфная сетка абхапляе толькі фактычныя кадры вучнёўства школ ФЗВ, а таксама брыгаднае і індывідуальнае вучнёўства тых прадпрыемстваў, дзе ўведзена цьвёрдая програма навучаньня і вучні набываюць належную кваліфікацыю.

У тым выпадку, калі навучаньне ў школах ФЗВ і навучаньне брыгаднага і індывідуальнага вучнёўства праходзяць па аднолькавай програме, аплата працы падросткаў утвараецца па аднолькавым разраду тарыфнай сеткі.

Пераход вучняў з аднаго разраду ў другі па новай тарыфнай сетцы адбываецца праз кожныя 6 месяцаў. Дапушчаецца і датэрміновы пераход вучняў у вышэйшыя разрады ў тым выпадку, калі яны набылі патрэбную кваліфікацыю.

Вучні дапушчаюцца да зьдзельшчыны.

У апошні год свайго навучаньня вучні дапушчаюцца і да зьдзельнай працы. Аплата зьдзельнай працы вучняў утвараецца па аднолькавай расцэнцы з усімі дарослымі рабочымі.

А як у працколектывах?

У працколектывах сыстэма аплаты працы вучняў застаецца ранейшай.

Першыя 6 месяцаў працы вучні атрымоўваюць зарплату ў страхкасе. Па сканчэньні гэтага тэрміну падросткі пераводзяцца ў адпаведны разрад вучнёўскай тарыфнай сеткі.

Але адначасова трэба памятаць, што ніякіх асобных сетак для тых падросткаў, якія ўжо не зьяўляюцца вучнямі і выконваюць аднолькавую працу з дарослымі рабочымі, у працколектывах не дапушчаецца.

Новую сетку ў жыцьцё.

На Беларусі новая тарыфная сетка для вучняў пачынае шырока распаўсюджвацца і ўжываецца ўжо ў некаторых галінах нашай прамысловасьці.

Па саюзах швэйнікаў, папернікаў і скурнікаў новая тарыфная сетка ўжо ўведзена.

Ня ўводзіцца вучнёўская тарыфная сетка па адной толькі шкляной прамысловасьці, дзе аплата працы вучняў будзе ўтварацца па агульнай тарыфнай сетцы рабочых.

М. З.

Забясьпечым права на вучобу.

Паўторым сёлетняга вопыту.

У гэтым годзе курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ адчыніліся ў Менску толькі тады, калі ў Маскве, Ленінградзе і інш. гарадох **такія курсы ўжо спынялі сваю працу.** Да гэтага трэба дадаць, што курсы нашы адразу павялі шкурніцкую політыку, нормы Акрана былі пакінуты бяз увагі і прыём вызначаўся адным прынцыпам: „Колькі дасі?“

Зразумела, што такія ўмовы ні ў якай меры не садзейнічалі доступу працоўнай моладзі ў ВНУ. Аб гэтым «садзейніцтве» шмат пісалі ў газэтах, але на справе, як мы бачым, было зроблена мала. Дзеці інтэлігенцыі і добра-аплачваемых служачых мелі больш шансаў на паступленьне ва унівэрсытэт, бо яны рыхтаваліся з пэдагогамі і рыхтаваліся досыць доўгі час. Рабочаму-ж хлапцу ці сыну дробнага служачага прыходзілася перамагаць дзесяткі перашкод, каб падрыхтавацца да конкурсу.

Каб не паўтарыць гэтага і цяпер, неабходна зараз-жа ўзьняць перад ЦСПСБ і акрана пытаньне аб організацыі курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ для працоўнай моладзі. Зрабіць гэта неабходна як мага хутчэй. Трэба памятаць, што патрабаваньні да паступаючых у ВНУ з кожным годам павялічваюцца і нельга організоўваць падрыхтоўку «на скорую руку» перад самым пачаткам прыёму.

Тав. **Бухарын** надаўна на Маскоўскай губпартконфэрэнцыі зазначыў, што пытаньне аб уцягненьні комсамольцаў і наогул рабочай моладзі ў ВНУ ставілася ўжо даўно, а «воз и ныне там». Над гэтым варта задумацца.

Своечасовай організацыяй курсаў мы зможам сьпіхнуць з месца гэты „воз“ і забясьпечыць за рабочай моладзьдзю права на вучобу ў вышэйшых навучальных установах.

І. Біндлер.

Цень на месяцы.

Здавалася-б, што марознае надвор‘е 8-га сьнежня ўвечары павінна было пашкодзіць назіраньням зацямненьня месяца, якое здарылася ў гэты дзень.

Але-ж не. Ужо з 5-ці гадзін на дварох і пляцох можна было заўважыць невялічкія групкі хлапцоў, погляды якіх былі накіраваны ў цёмна-сінюю вышыню неба, туды, дзе серабрыстым сьветам блішчэў дыск месяца.

— Глядзі, глядзі, пачынае зацямняцца...

— Дзе, ужо?

— Вунь, зірні ў бінокль.

Спачатку нішто не гаварыла, што круглая, бездакорна чыстая паверхня зямнога спадарожніка зьменіцца ў колеры і пацямнее. Але вось на левым баку яго зьявілася невялічкая цьмяная плямачка авальнай формы, якая пры назіраньні ў бінокль набывае выгляд туманнага ценю.

Паступова цьмяная пляма на месяцы расьце і гусьцее. На вачох гледачоў адбываецца пагружэньне месячнага дыску ў туманны цень, які пакрыў цалкам паверхню месяцу роўна а 8-й гадзіне.

Гледачы сочаць. Прабываньне ўсёй паверхні месяцу ў зямным ценю цягнецца 15 хвілін, пасьля чаго апошняя пачынае павольна спаўзаць з месячнага дыску.

А ў пачатку 9-й гадзіны месяц зноў усплыў на цёмна-сінім небе.

Зямля. Сонца.

Зацьменьне месяцу адбываецца таму, што, абыходзячы вакол зямлі, месяц трапляе ў цень, якую адкідвае зямля. Даўжыня зямной цені дасягае 1 мільёну 294 тысячы вёрст у той час, як месяц круціцца вакол зямлі на адлегласьці 360 тысяч вёрст.

Натуральна, што месяцу прыходзіцца часамі праходзіць праз цень, якую адкідвае зямля. Тады бліскучы дыск месяцу цямнее—адбываецца месячнае зацьменьне.

Вучоныя могуць прадсказаць зацямненьні месяцу за тысячы год уперад.

Я. З.

Маніфэст ажыцьцяўляецца.

Беднякі вызваляюцца ад падатку.

Заканчваецца праца па вызваленьню ад сельска-гаспадарчага падатку бядняцкіх гаспадарак БССР.

Парадак вызваленьня ад падатку наступны: сьпісы гаспадарак, падлягаючых ільгоце, складаюцца сельсаветамі і абмяркоўваюцца на сходах беднаты. Пасьля паправак і зьмен, унесеных сходамі, сьпісы паступаюць на зацьвярджэньне райвыканкомаў.

Сумы скідачнага фонду хопіць для вызваленьня ад падатку **ўсіх сялян-беднякоў.** Усяго будзе звольнена ад падатку 280 тысяч сялянскіх двароў, што складае 35 проц. іх агульнага ліку.

Агульная сума скідак-ільгот, якія прадстаўляюцца ў БССР бяднейшаму сялянству, складае 1 мільён 400 тысяч рублёў.

На волю.

Заканчваецца праца Менскай акруговай камісіі па вызваленьню арыштаваных з цэнтральнага спраўдому. Ужо вызвалена каля 600 чалавек.

На аказаньне дапамогі амніставаным асыгнавана звыш 3 тысяч рублёў.

У тры радкі.

29-га студзеня склікаецца ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ПАЛЯКАЎ, на які чакаецца 150 дэлегатаў.

— Інбелкульт падрыхтаваў да друку ДРУГІ ТОМ ТВОРАЎ М. БАГДАНОВІЧА.

— 8-га сьнежня ЗАЧЫНІЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА, якую наведала каля 10 тысяч чалавек.

— ПЕРАВЫБАРЫ ЯЧЭЕК ТСА-АВІЯХІМУ пачнуцца ў БССР 20-га сьнежня гэтага году:

— Акруговы аддзел працы выдае штодня беспрацоўным Менску 550 ДАРМОВЫХ АБЕДАЎ.

— Згодна пастановы Наркамату Аховы Здароўя, ва ўсіх буйных гарадох БССР АДЧЫНЯЮЦЦА КУРСЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ САНІТАРАЎ.

— У Горацкай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі навучаецца сёлета 1417 СТУДЭНТАЎ.

— У Чэрвені будуецца НОВАЯ ЭЛЕКТРОСТАНЦЫЯ, на абсталяваньне якой Менакрвыканком асыгнаваў 6 тысяч р.

— Беларускі Музэй Рэволюцыі атрымаў нядаўна шмат новых экспонатаў, сярод якіх маюцца ЗАПРАЎДНЫЯ ДАКУМАНТЫ ПАРЫСКАЙ КМУНЫ.

— Праўленьне БДУ вызначыла пабудаваць у Менску ВЯЛІКІ АНАТОМІЧНЫ ІНСТЫТУТ для практычных заняткаў студэнтаў Мэдфаку.

Курсы сыравараў і масларобаў.

У Магілеве адчыняюцца ўсебеларускія курсы сыравараў і масларобаў, куды будзе прынята 70 чалавек.

Заняткі на курсах пачнуцца 1-га студзеня і працягнуцца 3 месяцы. Камандыраваць на курсы маюць права ўсе вясковыя малочныя арцелі.

Хутка гадавіна Чырвонай арміі,

23-га лютага 1928 году мінае 10-я гадавіна існаваньня Чырвонай арміі.

Управа Беларускага Вайсковага Вокругу вылучыла цэнтральную камісію дзеля падрыхтоўкі да сьвяткаваньня гэтай гадавіны ў БССР. У склад камісіі ўваходзяць: прадстаўнікі політкіраўніцтва БВА, ЦК КП(б)Б, ураду БССР, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ.

Вясёлы куток.

Аб густах не спрачаюцца

— Кажуць, скарачэньне штатаў—ліха. А вось я, працуючы ў майстэрні спраўдому, з радасьцю думаю: а можа мяне па амністыі скароцяць?..

Сярод краўцоў.

— А ты, Мікіта, чые штаны латаеш?

— Відаць, комсамольскага актывіста; зусім у іх азадак прасядзеўся.

З вясковых гутарак.

— А ваш старшыня камітэту ўзаемадапамогі ўчора 50 рублёў членскіх узносаў сабраў

— А ты адкуль ведаеш?

— Ды я-ж прыказчык крамы Белдзяржсьпірту!

* * *

— Ганна, а як завуць таго хулігана, што кожны вечар цябе падпільноўвае ды вазаляе?

— Ніхто яго не заве. Ён сам брыдота прыстае...

З прыказак комсамольскага бюрократа.

— Калі ідзеш на сход, памятай галоўнае: зарэгістравацца.

Вакол „Тэрасы“.

Напярэдадні Кастрычніка. Матрос Барыка «робіць рэволюцыю» на вёсцы... Агітуе сярод сялян і гадзінамі гутарыць з паненкай Манюняй аб... Бэтговэне. Паміж іншым, гэты «гэрой» прароцка выпальвае словы аб прыцягненьні інтэлігенцыі да савецкага будаўніцтва—гэта ў 1917 годзе, у распале вялікіх рэволюцыйных падзей.

Хто-ж об‘екты яго ўплыву? Вось, напрыклад, Таццяна—дачка садоўніка. Яна таксама марыць аб рэволюцыі—калі паноў прагоняць, яна-ж зможа вучыцца іграць Бэтговэна, а покуль што ёй нічога не перашкаджае паверыць сьлюнявенькім словам белага афіцэра і аддацца яму.

Але абмалёўваць людзей рэволюцыі—не задача аўтара. Трэба паказаць тых, хто на тэрасе.

Вось стары пан Барэновіч, яго сын, жонка брата... Калі гэта «буржуазія»—значыць абавязкова трэба «разлажыць»... Стары пан кідае словы «сукіны сыны», «сволачы», яго сын б‘е пачыньне і спакушае жаночыя сэрцы, жонка брата «сводит с пути истинного» юрадзівенькага гімназыста Гэнадзія...

Для таго, каб канчаткова пераканаць гледача ў тым, што „буржуазія разлагаецца“, створаны нават цэлы трэці акт з цыганскімі сьпевамі, скокамі і зноў лапаньнем жанчын... Але і гэтага аўтару мала: «а раптам глядач не паверыць, што пан Барэновіч — «разлажыўшыся» элемэнт?»... Аказваецца, што Таццяна, яго дачка, «грэх маладосьці». І вось дзяшовенькі мэлёдраматычны прыём: труп Таццяны, якая пакончыла самагубствам, зьяўляецца ў канцы трэцяга акту, «утварае ўражаньне» і зьяўляецца ледзь не асноўнай прычынай сялянскага бунту.

— Здаецца ў 1917 годзе былі і эсэры—успомніў аўтар... І даецца голая карыкатурны тып эсэра—«нежны» чалавек з яўрэйскім акцэнтам. Другі эсэр—левы, наогул, нейкая недарэчнасьць. Бегае туды і сюды з портфэлем, увесь час гаворыць штучна-ўзьнятым мітынговым тонам... І гэта выдаецца за жывыя вобразы рэвалюцыйнай эпохі! Ёсьць прадстаўнік белых—тэкінскі афіцэр, які гаворыць «дэмовічным» тонам, п‘е, ліха скача лезгінку і рыкае лёзунгі аб сьмерці за цара...

На тэрасе павінны быць і дадатныя тыпы (трэба разумець—тая частка інтэлігенцыі, якая пайшла супрацоўнічаць з чырвонымі). Прадстаўнік гэтай часткі інтэлігенцыі—брат пана—доктар Андрэй. Ён увесь час з чырвонымі, нават да таго, што... па яго загаду вызваляецца з пад арышту ўся панская сям‘я... Няма чаго казаць—узорная рэволюцыйная адданасьць!

Чуў аўтар, што Кастрычнікавую рэвалюцыю ўтварыў пролетарыят. І вось раптоўна на вёсцы зьяўляецца рабочы—самы сапраўдны пролетары ў скуранай тужурцы і цыгаркай у руках. Ён дае загады—і ўсё ідзе, як па маслу.

А сяляне? Яны ходзяць з граблямі і цапамі, паказваюць кулакі і праяўляюць рэволюцыйную сьвядомасьць. А на самой справе іх роля ня больш, чым тых дрэў, якія стаяць на сцэне для фону. Трэба-ж паказаць, што дзея разгортваецца ў вёсцы!

Усё гэта круціцца на «злополучной» карусэлі—вышыня рэжысэрскага таленту!

* * *

Мы-б ня пісалі аб гэтым недарэчным па зьместу спэктаклі, уся вартасьць якога правільна была вызначана рэцэнзіямі ў нашых партыйных органах «Зьвязда», «Рабочий» і ў «Чырвонай Зьмене». Але нас прымушае да гэтага зьявіўшыйся на старонках газэты «Савецкая Беларусь» ліст групы пісьменьнікаў і культурных дзеячоў.

«Не ўваходзячы ў разгляд» рэцэнзій у партыйных і комсамольскіх газэтах, аўтары лісту адзначылі толькі, што гэтыя рэцэнзіі «ганебныя» проста дзіцячыя заметкі» і „маюць характар зусім асабовы, пабудаваны на нейкіх індывідуальных меркаваньнях (!) і ў значнай меры высьвятляюць **маральны і разумовы твар іх аўтараў у няспрыяючы для іх бок**“.

Што гэта значыць? Папершае супроць думак, якія былі выказаны ў рэцэнзіях, аўтары лісту нічога па сутнасьці не маглі сказаць і абмяжаваліся парай сапраўды **ганебных, абураючых і беспадстаўных выпадаў** супроць нашай прэсы.

Аўтары лісту, бяручы на сябе ролю адзіных абаронцаў беларускага тэатру, у канцы канцоў даводзяць тое, што быццам БДТ—2 такі няшчасны, такі адзінокі і нейкія „падазроныя элемэнты“ жадаюць яго „уничтожить“.

Таварышы крытыкі! Малады Беларускі Тэатр ня мае патрэбу ў такой „абароне“, як ваша.

Мы ўсе добра ведаем, і аб гэтым шмат разоў на старонках газэты пісалі, што гэты тэатр мае вялікія дасягненьні, што там добры склад мастацкага колектыву, што гэты Тэатр яшчэ многа ўнясе ў скарбніцу беларускай культуры.

Не віна тэатру, што п‘еса Грамыкі такая няўдалая. Мы ўпэўнены, што далейшыя працы БДТ-2 дадуць тое, што патрабуе ад яго пролетарская грамадзкасьць.

Мы вітаем прапанову аб організацыі дыспуту наконт п‘есы „Каля тэрасы“. Мы заклікаем на гэты дыспут усіх комсамольцаў, усю рабочую моладзь.

Асобныя пастаноўкі маладога беларускага тэатру маюць патрэбу ў здаровай пролетарскай крытыцы.

Адашчык, Богат, Вержбаловіч, Гарбуз, Гольдбэрг М., Каліта, Качан Я., Нарон, Сучкова, Таўбэ, Шамко, Пятровіч.

алло... слухайце алло слухайце

На Менскай радыё-станцыі імя Саўнаркому БССР.

Днём там толькі стукае пішучая машынка. Чалавек з навушнікамі калі-ні-калі папраўляе і пакручвае маленькія рычажкі чатырох лямпавага радыё-прыёмніку. Пальцы яго бадай увесь час заняты друкаваньнем.

Весткі ТАСС‘у (Тэлеграфнае Агэнцтва Савецкага Саюзу) аб міжнародных падзеях, мэтэоролёгічныя бюлецені аб становішчы надвор‘я, паведамленьні аб розных зьездах, аб здарэньнях у рэспубліках Савецкага Саюзу--усё гэта першым выслухоўвае чалавек з навушнікамі і ўважліва перадрукоўвае на вялікія лісты паперы. А вечарам, з чарговым нумарам радыё-газэты, дыктар (чытальнік) аб усім гэтым раскажа рабочым і сялянам краіны... Вечарам ідуць радыё-перадачы.

На радыё-станцыі ў гэты час павінна быць ціха. Кашляне хто-небудзь, а ў далёкім кутку Мазыршчыны адгукнуцца: „Чуеце? у Менску сырое надвор‘е“.

А перадачы станцыі самыя разнастайныя: радыё-газэта, гутаркі (з сялянамі, з хатнімі гаспадынямі, піонэрамі, хворымі і інш.), концэрты, справаздачы ўраду, асобных наркаматаў...

Нярэдка Ігнатоўскі, Баліцкі ці Прышчэпаў гутараць з сялянамі на тэмы аб народнай гаспадарцы, працы хат-чытальняў, асьветы сялян і інш.

Рэгулярна, кожны дзень—радыё-газэта. У абабітым чырвоным палатном мікрафонным пакоі (тут чытаюцца даклады, адбываюцца концэрты і інш.) дыктар мерна чытае з лісткоў доўгай белай паперы аб апошніх падзеях, цэнах на жыта, выпуску новай партыі малатарняў і трактараў...

Крыху пазьней з мікрафоннага пакою нясуцца ў эфір словы аграномаў аб мэтадах паляпшэньня сельскай гаспадаркі, шматпольлі, карысьці кавюшыны...

Рыбацкімі сеткамі раськінуліся па абшарах радыё-антэнны. Сёньня ў іх багаты ўлоў... Уся Беларусь слухае голас радыё.

* * *

У Забалоцкай хаце-чытальні днём толькі скрыпіць пяро загадчыка. Ён рыхтуецца да дакладу, піша допісы аб жыцьці Забалоцьця ў „Беларускую Вёску“, ліст на радыё-станцыю аб якасьці перадач...

Вось ужо 4 месяцы, як Забалоцьце мае свой двухлямпавы прыёмнік.

І загадчык дзеліцца сваім вопытам у радыё працы з Менскай радыё-станцыяй імя Саўнаркому БССР. Ён ведае, што праз тры дні гучна-гаварыцель перадасьць яму адказ працаўнікоў станцыі. Яму растлумачаць—чаму днём кепска чуцен Бэрлін, чаму „Новы Комінтэрн“ (Маскоўская радыё-станцыя) пяжка „азавіць“. На ўсе запытаньні атрымае адказ. І загадчык доўга сядзіць над лістом да радыё-станцыі.

Вечарам сяляне зьбіраюцца ў чытальню.

У цэнтры ўвагі ўсіх—радыё. Старыкі і дзеці, хлопцы і дзяўчаты цэлыя гадзіны слухаюць перадачу.

А Менская станцыя сапраўды здолела блізка падыйсьці да сялянскіх запатрабаваньняў. Беларускія сьпевы, мотывы нацыянальных скокаў, апавяданьні Крапівы—такая програма блізкая і зразумелая. І, побач з гэтым, больш складаны рэпертуар. Напрыклад, „Восень у музычных творах Мэндэльсона, Чайкоўскага Глінкі“, „Расійскія абрады ў музыцы“ і інш.

Весялей за ўсё па суботах. Ужо а 5-й гадзіне рассоўваюцца лаўкі, сталы. Ля дзьвярэй чытальні вісіць плякат:

Сёньня ў хаце-чытальне вечар скокаў! Духавы оркэстр.

Першы раз усе падумалі, што, мабыць, мана, бо адкуль-жа ў вёсцы духавы оркэстр? А цяпер уже ўсе добра ведаюць, што хоць оркэстр гэты на Менскай станцыі—скакаць можна тут, у хаце-чытальні... У гэты дзень у чытальню зьбіраюцца з усіх наваколічных вёсак. Да позьняй ночы—скокі. Без самагону, валіхвацкіх гармоністых і панажоўшчыны.

Дзед Якім доўга трымаўся думкі, якую выказваў наступнымі словамі:

— Чорт гэта грае ў трубцы! А загадчык пэўне сваю душу яму запрадаў—крывёю расьпісаўся на вогненнай паперы.

Але адвойчы з гучна-гаварыцеля пачулася:

— Таварышы сяляне Забалоцкай ячэйкі! Паклічце сюды дзеда Якіма! Даём 10 хвілін.

Праз 5 хвілін дзед Якім быў у чытальні. Яму „чортава трубка“ сказала:

— Чарцей на сьвеце няма! Слухайце, адкуль узялося радыё.

І дзеду Якіму ўсё падрабязна растлумачыла «чортава трубка».

З Забалоцьця пішуць, што Якім цяпер самы шчыры прыхільнік радыё на вёсцы. І калі запсавалася нешта ў прыёмніку, ён першы даў 10 фунтаў жыта на рамонт.

* * *

Такіх Забалоцьцяў шмат па Беларусі. Кожны дзень радыё-станцыя атрымлівае лісты з вёсак з апісаньнем радыё-працы.

Працаўнікі станцыі ведаюць сваю справу, яны адданы ёй. Ночы ня сьпяць за пробнымі перадачамі, за паляпшэньнем якасьці перадач. І нам застаецца толькі далучыцца да слоў, выказаных у лісьце аднаго з сялян:

— «Дзякуючы радыё, мы заўсёды цяпер ведаем усё, што робіцца на сьвеце. У глушы жывучы, мы разам з Масквой і Ленінградам даведваемся аб усім. Вялікае дзякуй! Працуйце сваю вялікую працу. Мы вас слухаем».

Н. Анцыбрскі.

Згублены.

— Кандыдацкая картка за № 1043 на імя Хігеровіча Р., выдадзеная Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 55249 на імя Розінай Х. А., выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 38780, на імя Хадыка Б. М., выдадзены Менакругкома ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 7183, на імя Жыдаля, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

Галоўлітбел № 24867.

Адказныя рэдактары: (А. Бараньнікаў (А. Курцік

1-ая дзяржаўная друкарня.